Источник: "Рэспубліка" - 2013-06-15

# Дыск з мінулага

***Радзівілаўская Біблія з'явілася на DVD.***

У Мінску 18 чэрвеня адбудзецца прэзентацыя электроннага выдання «Брестская Библия: к 450-летию издания». Знакамітая Брэсцкая, ці Радзівілаўская, Біблія выйшла ў свет у 1563 годзе. У свой час гэта было самае фундаментальнае і прыгожа афармленае выданне Святога Пісання ў Вялікім Княстве Літоўскім. Ініцыятарам яго стварэння стаў дзяржаўны і ваенны дзеяч, актыўны прыхільнік рэфармацыі Мікалай Радзівіл Чорны. Ён заказаў кальвінісцкі пераклад Бібліі на польскую мову і фінансаваў аб'ёмнае раскошнае выданне.

Лёс кнігі склаўся трагічна. Экзэмпляраў, што захаваліся да нашага часу, засталося вельмі мала. У Беларусі адзіная кніга знаходзіцца ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы Нацыянальнай акадэміі навук. Яна і выступіла ініцыятарам стварэння паўнатэкставай электроннай версіі гэтага рэдкага выдання. Праект здзейсніўся дзякуючы фінансавай падтрымцы ААТ «Белаграпрамбанк» і супрацоўніцтву з бібліятэкай Літоўскай акадэміі навук. Алічбоўку і падрыхтоўку макета забяспечыў Беларускі навукова-даследчы цэнтр электроннай дакументацыі.

Экзэмпляры DVD-выдання перададуць у дар прадстаўнікам буйнейшых бібліятэк і іншых установаў навукі, адукацыі і культуры.

**Ул. інф.**

"Рэспубліка". Дыск з мінулага